дапаможнікі і інш. Выдадзеныя асобнымі брашурамі ў пэўнай колькасці экзэмпляраў, яны могуць выкарыстоўвацца студэнтамі, якія праходзяць педагагічную практыку па-за кіраўніцтвам ад нашага універсітэта.

Падрыхтоўка справаздачнай дакументацыі пасля заканчэння практыкі, удзел у рабоце выніковай канферэнцыі, выступленні кіраўнікоў, практыкантаў з крытыкай недахопаў, асвятленнем станоўчых бакоў педагагічнай дзейнасці будучых спецыялістаў садзейнічаюць фарміраванню ў студэнтаў трывалых ведаў па методыцы, тэхніцы, тэхналогіі выкладчыцкага майстэрства. Тут адбываецца асэнсаванне ўсіх нюансаў, магчымых пралікаў, памылак, пошукаў, знаходак. На выніковай канферэнцыі вызначаюцца агульныя характэрныя недахопы ў рабоце педагога-пачаткоўца, што адыгрываюць значную ролю ў фарміраванні прафесійных якасцей.

З'яўляючыся істотным кампанентам навучальнага працэсу, педагагічная практыка, такім чынам, садзейнічае фарміраванню патрэбных якасцей спецыяліста па народных рамёствах. Гэтыя якасці вызначаюць будучую прафесійную дзейнасць студэнта-завочніка.

**Чаплыгіна Т.І.**, ст.выкладчык
**Стрыжонак І.М.**, ст.выкладчык

## АРГАНІЗАЦЫЯ І МЕТОДЫКА ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ НЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Завочная сістэма навучання дае добрую тэарэтычную падрыхтоўку, садзейнічае павышэнню кваліфікацыі. Праўда, значная колькасць тых, хто паступае на факультэт завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры, працуе не па сваёй спецыяльнасці. Адсутнасць такога вопыту работы перашкаджае гэтым студэнтам асвойваць спецыяльныя дысцыпліны. Так, пасля анкетавання высветлілася: існуе сувязь паміж характарам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесійнай дзейнасці студэнтаў і ўзроўнем засваення матэрыялу курса “Бібліятэчны менеджмент”.

Досыць глыбока ведаюць тэорыю студэнты, якія маюць навыкі вядзення ўліковых, справаздачных формаў бібліятэчнай работы, разліку паказчыкаў працы бібліятэк па вытворчых выніках, запаўнення фінансавых дакументаў і г.д. У студэнтаў, якія не працуюць у бібліятэках, няма падобных навыкаў, і ім цяжка ўспрымаць курс, выкладанне якога разлічана на асоб з пэўным узроўнем прафесійных ведаў. Вось чаму большую частку нездавальняючых адзнак па спецыяльных дысцыплінах атрымліваюць студэнты, якія не працуюць па сваёй спецыяльнасці. У 1995/96 навучальным годзе іх на факультэце завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры было 18 чалавек. Гэта склала 33% ад колькасці студэнтаў факультэта. У 1996/97 годзе іх было 15 чалавек, або 28%. У 504 групе, напрыклад, яны склалі 45% ад саставу групы.

Для знаёмства завочнікаў з характарам іх далейшай работы па спецыяльнасці праводзіцца вытворчая практыка на працягу месяца. Асаблівасцю яе з'яўляецца тое, што яна праходзіць без адрыву ад вытворчасці, у больш скарочаны тэрмін, чым на стацыянары.

Распрацавана праграма практыкі, у якой прадугледжаны першапачатковае знаёмства, вывучэнне, аналіз, удзел у рэалізацыі найноўшых інфармацыйных тэхналогій, разгляд пытанняў бібліятэчна-інфармацыйнага менеджменту, дзейнасць па фарміраванні бібліятэчнага фонду, каталагізацыі дакументаў, бібліяграфічная работа.

Практыку студэнты праходзяць на 4-5 курсах. Арганізоўвалася яна раней звычайна па месцы жыхарства. Гэта было не заўсёды эфектыўна: узнікалі цяжкасці ў правядзенні кансультацый з выкладчыкамі спецыяльных кафедраў, якасць баз практыкі не заўсёды адпавядала патрабаванням нашага універсітэта.

Апошнія тры гады практыка студэнтаў-завочнікаў, у асноўным жыхароў г.Мінска, арганізоўвалася на базе ЦДБ імя Я.Купалы г.Мінска, Мінскай абласной бібліятэкі імя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А.С.Пушкіна, што станоўча адбілася на ходзе вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Вядома, што правільная арганізацыя практыкі ўплывае на яе правядзенне. У вырашэнні гэтай праблемы важная роля належыць такім формам работы:

— мэтанакіраванае правядзенне ўстановачнай канферэнцыі;
— складанне прыкладных памятак, тэхналагічных карт, схем па асноўных раздзелах бібліятэчна-бібліяграфічных курсаў;
— вывучэнне абавязкаў асоб, якія займаюць пасады ў аддзелах, уліковай, справаздачнай дакументацыі;
— правядзенне калёквіуму па найважнейшых пытаннях тэорыі і практыкі бібліятэчнай справы.

Сродкамі, што спрыяюць актыўнаму правядзенню практыкі, з'яўляюцца: падрабязнае вывучэнне ўліковай, справаздачнай, планавай дакументацыі; знаёмства з напрамкамі маркетынгавых, навуковых даследаванняў, наменклатурай бібліяграфічных прадуктаў, паслуг, што аказвае бібліятэка; вывучэнне аўтаматызацыі бібліятэчных, інфармацыйных працэсаў, тэхналогіі фарміравання фонду бібліятэкі, традыцыйнай, аўтаматызаванай каталагізацыі дакументаў, эфектыўнасці іх выкарыстання ў бібліятэцы.

Арганізацыя практыкі ажыццяўляецца кіраўнікамі практыкі ад універсітэта, загадчыкамі, іх намеснікамі ад бібліятэк шляхам праверкі дзённікаў, якія вядуць студэнты-завочнікі, правядзення кансультацый, метадычных нарад, наведвання аддзелаў бібліятэкі, дзе працуюць практыканты.

Па выніках практыкі завочнікі робяць справаздачы, абараняюць іх перад кіраўнікамі практыкі ад універсітэта, базы. Практыка выкарыстоўваецца для збору, апрацоўкі, аналізу матэрыялу, патрэбнага для напісання кантрольных работ па курсе "Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент" і тэмах: "Аналіз дзейнасці бібліятэк (на падставе статыстычных справаздач)", "Адзіная сетка бібліятэк рэгіёна (арганізацыя абслугоўвання гарадскога або сельскага насельніцтва)", напісання курсавых, дыпломных работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Існуе шэраг арганізацыйных пытанняў, вырашэнне якіх будзе садзейнічаць удасканаленню практыкі. Перш за ўсё гэта пытанне пра яе працяг. Месячнага тэрміну, адведзенага на практыку, не хапае для азнаямлення з асноўнымі тэхналагічнымі цыкламі бібліятэкі. Трэба ўлічваць і тое, што праходзяць студэнты-завочнікі практыку без адрыву ад асноўнай працы. Таму мэтазгодна было б павялічыць тэрмін практыкі, вызначыць яго асобна: для тых, хто слаба ведае дзейнасць бібліятэк, і тых, хто працуе на прадпрыемствах, ва ўстановах, у фірмах, тэрмін практыкі — 2—3 месяцы; для тых жа, хто працуе па сумежнай спецыяльнасці, — 1—2 месяцы. Найбольш рацыянальна праводзіць практыку завочнікаў у канцы 4 або ў пачатку 5 курса навучання ў Беларускім універсітэце культуры, у 8—9 семестрах. Праводзіцца яна павінна з адрывам ад вытворчасці. Гэта, безумоўна, будзе спрыяць з'яўленню глыбокіх, дасканалых тэарэтыка-метадычных ведаў, фарміраванню практычных уменняў, навыкаў бібліятэчнай работы. Практыка павінна грунтавацца не на асабістай дамоўленасці, як гэта робяць зараз, а праводзіцца цэнтралізавана, праз адпаведныя аддзелы універсітэта. Для баз практыкі патрэбна адбіраць ЦБ ЦБС і рэспубліканскага ўзроўню, буйныя універсальныя навуковыя і галіновыя бібліятэкі нашай рэспублікі.

Для далейшага павышэння ўзроўню вытворчай практыкі неабходна ўзмацніць адказнасць студэнтаў-завочнікаў за якасць яе праходжання; больш патрабавальна ставіцца да справаздач студэнтаў (іх абарона павінна адбывацца ў камісіі на базе практыкі); дэканату, спецыяльным кафедрам больш настойліва патрабаваць ад студэнтаў, пачынаючы з 3 курса, пераходзіць на працу па спецыяльнасці, аказваць у гэтым нават пэўную дапамогу.

Бібліятэчна-бібліяграфічная справа — галіна духоўнай вытворчасці, дзе вызначальную ролю адыгрываюць не толькі тэарэтыка-метадычныя веды, але таксама і практычныя ўменні, навыкі, на фарміраванне якіх уплывае выдатна арганізаваная вытворчая практыка. Без яе нельга выканаць складаную задачу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для бібліятэчна-інфармацыйных устаноў краіны.

**Кузьмініч М.Л., дацэнт**

## ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА Ў СІСТЭМЕ МАСТАЦКА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Адным з перспектыўных накірункаў дзейнасці Беларускага універсітэта культуры з'яўляецца падрыхтоўка педагагічных кадраў для сферы мастацкай культуры.

Авалоданне тэхналогіяй выхавання вучняў сродкамі пэўнага віду мастацтва немагчыма без глыбокага ведання тэарэтычных дысцыплін, прадстаўленых цяпер у вучэбным плане. Гэта, з аднаго боку, прадметы псіхолага-педагагічнага цыкла: псіхалогія (агульная, сацыяльная, узроставая, педагагічная, мастацкай творчасці), педагогіка (агульная і прафесійная — музычная, тэатральная), методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін. З другога боку, гэта прадметы, што забяспечваюць мастацка-прафесійную падрыхтоўку спецыялістаў. Метадалагічную аснову прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі будучыя спецыялісты атрымліваюць у час вывучэння філасофскіх прадметаў, найперш эстэтыкі. Імкненне выкладчыкаў развіць у студэнтаў педагагічныя здольнасці, уменні, навыкі, сфарміраваць педагагічнае ўмельства — аснову педагагічнага майстэрства — рэалізуецца ў распрацоўцы і наступным увядзенні ў вучэбны план новых прадметаў: прыватных методык, спецыяльных курсаў, семінараў, практыкумаў, факультатываў і г.д. У педагагічных ВНУ чытаюцца такія прадметы, як "Уводзіны ў выкладчыцкую спецыяльнасць", "Агульная методыка вучэбнай работы", "Гісторыя педагогікі", "Асновы педагагічнага майстэрства", "Метадалогія і методыка педагагічных даследаванняў", "Псіхолага-педагагічныя асновы эстэтычнага выхавання", "Методыка арганізацыі мастацка-творчай дзейнасці вучняў", "Асновы сямейнай педагогікі і методыка работы з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ